**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

УДК 940.5(438)”1970 – 1989”

**Лаўрыненка Кацярына Віктараўна**

# Каталіцкі Касцёл у грамадска-палітычным жыцці ПНР у 1970 – 1989 гг.

07.00.03. – усеагульная гісторыя

Аўтарэферат
**дысертацыі на суіскание**
**вучонай ступені кандыдата гістарычных навук**

Мінск – 2005

Работа выканана у Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар
Кошалеў Уладзімір Сяргеевіч,
Беларускі дзяржаўны універсітэт,
кафедра гісторыі новага
і навейшага часу

Афіцыйныя апаненты – доктар гістарычных навук, прафесар
Корзун Міхаіл Сямёнавіч,
Беларускі дзяржаўны універсітэт,
кафедра гісторыі старажытнага часу
і сярэдніх вякоў

кандыдат гістарычных навук, прафесар
Лук'янаў Пётр Рыгоровіч,
установа адукацыі "Магілёўскі
дзяржаўны універсітэт
імя А. А. Куляшова",
кафедра ўсеагульнай гісторыі і культуры

Апаніруючая арганізацыя – установа адукацыі "Беларускі
дзяржаўны педагагічны
універсітэт імя Максіма Танка"

Абарона дысертацыі адбудзецца 5 мая 2005 г. у 14 гадзін на пасяджэнні савета Д 02.01.05 па абароне дысертацый на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасу: 220050, г. Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 4, ауд. 334.

Тэлефон вучонага сакратара: 227-45-11.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы "1" красавіка 2005 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый,
кандыдат гістарычных навук,
прафесар А. А. Яноўскі

## Агульная характарыстыка работы

**Актуальнасць тэмы даследавання**. Каталіцкі Касцёл у Польшчы з'яўляўся неад'емнай часткай развіцця дзяржавы і грамадства на працягу доўгіх часоў. Пасля другой сусветнай вайны Каталіцкі Касцёл застаўся фактычна адзіным незалежным грамадскім інстытутам у краіне. Ва ўмовах тагачаснага рэжыму Касцёл быў адзіным абаронцам правоў чалавека ў Польшчы і сваёй дзейнасцю падрыхтаваў глебу для зараджэння і існавання палітычнай апазіцыі ў краіне. У выніку Касцёл стаў адыгрываць вялікую ролю ў жыцці польскага грамадства і ўсё больш пашыраць сферу сваёй дзейнасці і ўплыву. У сферу зацікаўленняў Касцёла ўваходзілі практычна ўсе праблемы польскага грамадства. Вялікую ролю адыгрываў Касцёл і ў палітычных працэсах краіны, асабліва ў 1980-х гг., калі Касцёл стаў магутным палітычным фактарам у супрацьдзеянні камуністычнаму рэжыму. У выніку, нягледзячы на канфрантацыю паміж Касцёлам і камуністычным рэжымам, апошняму прыходзілася лічыцца з пазіцыяй Касцёла.

Аднак навуковая літаратура як СССР, так і краін, што знаходзіліся ў сферы яго ўплыву, адмаўляючы пазітыўную ролю рэлігіі ў жыцці грамадства, альбо ўвогуле не ўздымала гэтую праблему, ці разглядала яе ў негатыўным ключы. Толькі ў 1990 -я гг. склаліся больш аб'ектыўныя перадумовы для выкарыстання новых падыходаў у вывучэнні ролі і месца Каталіцкага Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР.

Вывучэнне гісторыі Каталіцкага Касцёла ў ПНР з'яўляецца састаўной часткай вывучэння гісторыі Польшчы. Без аналізу дзейнасці Касцёла, яго ролі ў грамадска-палітычным жыцці краіны не можа быць поўнай гісторыі гэтай краіны. Даследаванне з'яўляецца адказам на ўсплёск цікавасці ў апошнім дзесяцігоддзі айчыннай навукі да рэлігійнай праблематыкі. Акрамя гэтага, у беларускай гістарыяграфіі феномен Каталіцкага Касцёла ў ПНР, нягледзячы на пэўныя спробы даследчыкаў, з'яўляецца маладаследаваным і да гэтага часу.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**. Тэма дадзенага даследавання зацверджана на Вучоным Савеце гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (пратакол № 3 ад 22 снежня 1999 г.). Яна адпавядае навуковаму накірунку кафедры гісторыі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ.

**Мэта і задачы даследавання**. Мэта дысертацыйнай работы – стварыць комплексную карціну дзейнасці Каталіцкага Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР у 1970 – 1989 гг. У адпаведнасці з пастаўленай мэтай у рабоце вызначаны наступныя задачы:

1. Прааналізаваць эвалюцыю адносін паміж Касцёлам і дзяржавай у 1970 – 1980-я гг.
2. Выявіць пазіцыю Касцёла ў адносінах да палітычнай апазіцыі і "Салідарнасці".
3. Асвятліць уплыў абрання Кракаўскага мітрапаліта Вайтылы Папам і яго першага візіту ў ПНР на падзеі ў краіне.
4. Прасачыць дзейнасць Касцёла падчас перыяду ваеннага становішча ў 1981 – 1983 гг.
5. Даследаваць удзел Касцёла ў грамадска-палітычных працэсах ПНР у другой палове 1980-х гг.

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца сацыяльна-палітычнае жыццё польскага грамадства у 1970 – 1980-х гг. **Прадмет даследавання** – месца і роля Каталіцкага

Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР, узаемаадносіны паміж Касцёлам і дзяржавай, Касцёлам і грамадствам. Прадмет даследавання адпавядае мэце і задачам дысертацыйнага даследавання.

**Храналагічныя межы даследавання** ахопліваюць перыяд з 1970 г. да 1989 г. Выбар ніжняй мяжы абумоўлены тым, што з канца 1970 г. у ПНР пачынаецца новы этап у адносінах паміж Каталіцкім Касцёлам і дзяржавай. Выбар верхняй мяжы прыпадае на 1989 г., год падзення камунізму ў краіне, поўнай нармалізацыі адносін паміж Касцёлам і дзяржавай, а таксама атрымання Касцёлам правоў публічна-прававога статусу. Гэты перыяд характарызуецца нарастаючым сацыяльна-эканамічным і палітычным крызісам і ўсё большым уплывам Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці.

**Гіпотэза.** Працэсы, якія адбываліся ў ПНР на працягу пасляваеннага перыяду, спрыялі ўзмацненню пазіцыі Касцёла ў грамадстве, у той час як адбывалася страта даверу да ўладаў, якія гэта добра разумелі. Таму ў выніку крызісу 1970 г. дзяржава імкнулася да нармалізацыі адносін з Касцёлам. Але найбольшы ўплыў Касцёл набыў у другой палове 1970-х гг., асабліва пасля абрання Папам паляка, кардынала Вайтылы. Крызіс 1980 г. прывёў да неверагоднага ўзрастання ролі Касцёла ў жыцці грамадства. У выніку з 1980 г. Касцёл стаў вельмі магутнай сілай, якая актыўна ўплывала на грамадска-палітычнае жыццё ПНР.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання**. Тэарэтычную аснову дысертацыі складаюць сучасныя прадстаўленні аб функцыях, прынцыпах і метадах гістарычнага даследавання. Пры напісанні дысертацыі аўтар кіраваўся перш за ўсё прынцыпамі аб'ектыўнасці і гістарызму. У даследаванні прыменены як агульна-навуковыя (абагульненне, аналіз, сінтэз), так і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-параўнальны, сістэмны і гісторыка-тыпалагічны) метады.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў** заключаецца ў тым, што ўпершыню ў гістарыяграфіі Беларусі здзейснены сістэмны аналіз ролі і месца Каталіцкага Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР у 1970 – 1989 гг. У сваім даследаванні аўтар адмаўляецца ад панаваўшых раней ідэалагічных характарыстык у вывучэнні ролі Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР. У рабоце па-новаму асэнсаваны ўзаемаадносіны паміж Касцёлам і дзяржавай, яго адносіны з апазіцыяй і незалежным прафсаюзам "Салідарнасць". Даказана, што дзякуючы намаганням Касцёла ў Канстытуцыю не былі ўнесены непажаданыя для польскага грамадства змены, высветлена роля Касцёла ва ўзнікненні незалежнага прафсаюза "Салідарнасць", паказана станоўчая роля дзейнасці Касцёла ў перыяд сацыяльнай канфрантацыі 1980 – 1981 гг., выяўлена пасрэдніцкая роля Касцёла, якая папярэдзіла грамадзянскую вайну ў ПНР у 1980 – 1981 гг., што ў Касцёле існавалі дзве тэндэнцыі – за супрацоўніцтва з уладамі і супраць, прасочана, як на працягу 1980-х гг. Касцёл з пасрэдніка паміж дзяржавай і грамадствам ператварыўся ў паўнапраўнага партнёра ўладаў – гэта дало магчымасць прапанаваць новае канцэптуальнае асэнсаванне ролі Касцёла ў дадзены перыяд.

Сама пастаноўка праблемы, яе нетрадыцыйная трактоўка, крытычнае асэнсаванне канкрэтна-гістарычнага матэрыялу і атрыманых вынікаў запаўняюць прабелы ў айчыннай гістарыяграфіі ў вывучэнні гэтага пытання.

Навуковая навізна дысертацыйнага даследавання забяспечваецца таксама ўвядзеннем у навуковы абарот навейшых матэрыялаў і дакументаў на польскай мове і творчым падыходам да даследаванняў замежнай гістарыяграфіі.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Дысертацыя дазваляе значна кампенсаваць прабелы ў вывучэнні ролі Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР у 1970 – 1989 гг. Вынікі праведзенага даследавання будуць садзейнічаць распрацоўцы новых канцэптуальных падыходаў у пазнанні і навуковай ацэнцы складаных працэсаў, якія адбываліся ў ПНР у 1970 – 1989 гг. з удзелам Каталіцкага Касцёла. Уведзеныя ў навуковы абарот новыя матэрыялы, абагульненні і высновы дысертацыйнага даследавання могуць спрыяць пошуку і распрацоўцы новых аспектаў даследуемай тэмы.

Выкладзены ў дысертацыі матэрыял можа быць выкарыстаны для падрыхтоўкі вучэбнай літаратуры і абагульняючых прац, стварэння лекцыйных курсаў па гісторыі славянскіх народаў, спецыяльных курсаў па гісторыі рэлігіі.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. Змены ў сацыяльна-палітычным ладзе Польшчы пасля другой сусветнай вайны прывялі да змянення статусу Каталіцкага Касцёла. Касцёл страціў сваё прывілеяванае становішча ў дзяржаве, акрамя гэтага, распачалася канфрантацыя паміж Касцёлам і новай уладай. Касцёл жа, аўтарытэт якога ў вачах грамадства ўзрастаў, перайшоў ад абароны правоў уласнасці і ўлады, да абароны правоў сваіх вернікаў. Працэс гэты быў доўгі і паступовы, але падрыхтаваў ён глебу для дзейнасці Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР ў 1970 – 1989-х гг.

2. У выніку снежаньскага сацыяльна-эканамічнага крызісу 1970 г. улады ПНР зразумелі неабходнасць нармалізацыі адносін з Касцёлам. З аднаго боку, гэта было прызнанне сілы Касцёла, з другога – прывяло да яшчэ большага ўзмацнення яго пазіцыі ў польскім грамадстве. Касцёл рашуча стаў абараняць правы грамадзян. Гэта яскрава выявілася падчас крызісаў 1970 і 1976 гг., калі Касцёл пратэставаў супраць дзеянняў уладаў і выступіў у абарону пацярпелых. Сваю моц Касцёл прадэманстраваў і падчас падрыхтоўкі ўладамі непажаданых для польскага грамадства зменаў у Канстытуцыю.

3. Сваёй дзейнасцю Касцёл у вялікай меры паспрыяў узнікненню палітычнай апазіцыі ў ПНР. Апазіцыя ў сваю чаргу імкнулася да супрацоўніцтва з Касцёлам і нават выкарыстання яго аўтарытэту ў сваёй палітычнай дзейнасці. Вышэйшая каталіцкая іерархія ўсяляк гэтаму супраціўлялася, у той час як пэўная частка радавога каталіцкага духавенства ўступала ў апазіцыйныя арганізацыі і, такім чынам, прымала непасрэдны ўдзел у іх дзейнасці. Але Касцёл прыхільна ставіўся да культурных і асветніцкіх акцый апазіцыі і ўсяляк спрыяў ім.

4. Крызіс 1980 г. прывёў да яшчэ большага ўзмацнення ролі Касцёла ў жыцці польскага грамадства. Касцёл выходзіць на палітычную арэну. Улады пачалі шукаюць падтрымкі Касцёла ў змяншэнні напружанасці грамадска-палітычнай сітуацыі, у выніку Касцёл пачаў адыгрываць ролю пасрэдніка паміж уладамі і грамадствам ў вырашэнні грамадскх канфліктаў. Акрамя гэтага, Касцёл выконваў ролю пасрэдніка і мадэратара ў адносінах і кантактах урада з "Салідарнасцю".

5. Падтрымка Касцёлам забастовак рабочых на Узбярэжжы ў вялікай меры паспрыяла захаванню пазіцыі бастуючых, што і прывяло да ўзнікнення "Салідарнасці". Касцёл падтрымліваў "Салідарнасць" як арганізацыю, якая прадстаўляла і абараняла інтарэсы і пра-

вы працоўных. Але Касцёл баяўся празмернай радыкалізацыі прафсаюза і таму імкнуўся кантраляваць яго дзейнасць. Адначасова адносіны паміж Касцёлам і "Салідарнасцю" залежалі ад многіх фактараў, у тым ліку і ад асабістага стаўлення кіраўніка Касцёла ў Польшчы да прафсаюза і яго дзеячаў.

6. У перыяд ваеннага становішча Касцёл стаў уплывовай сілай у грамадстве, з якой вымушаны быў лічыцца ўрад. Вышэйшая іерархія Касцёла шмат зрабіла для змяншэння і супакаення грамадскага напружання. Касцёл актыўна абараняў правы грамадзян – як інтэрнаваных, так і тых, што засталіся на свабодзе. Акрамя гэтага, Касцёлам была праведзена вялікая дзейнасць на ніве дабрачыннасці.

7. У другой палове 1980-х гг. Касцёл вельмі актыўна ўдзельнічаў у грамадска-палітычных працэсах краіны. Вялікую ролю адыграў Касцёл у падрыхтоўцы да пасяджэнняў "круглага стала" паміж кіруючым рэжымам і апазіцыяй. У вялікай меры дзякуючы дапамозе Касцёла апазіцыя атрымала перамогу на выбарах 1989 г., што прывяло да падзення камуністычнай улады ў краіне.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя выканана самастойна, другія аўтары ў правядзенні даследавання і апрабацыі яго вынікаў не ўдзельнічалі. Суіскальнікам уведзены ў навуковы абарот шматлікі дакументальны матэрыял розных выданняў і перыёдыкі на польскай мове.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Матэрыялы дысертацыі прайшлі апрабацыю на міжнароднай канферэнцыі "Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире: место и значимость в развитии цивилизаций и культур (история, уроки, опыт и современность) (2002, Витебск), Міжнародных VII Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях (2002, Мінск), на міжнароднай канферэнцыі "История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: актуальные проблемы из исторического прошлого и современности" (2003, Витебск).

Асноўныя палажэнні і высновы дысертацыі абмяркоўваліся на пасяджэнні кафедры новага і навейшага часу БДУ, дзе яна была рэкамендавана да абароны.

**Апублікаванасць вынікаў.** Вынікі даследавання выкладзены ў 11 публікацыях. Агульны аб'ём публікацый складае 76 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з агульнай характарыстыкі, асноўнай часткі, якая ўключае тры раздзелы, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц і літаратуры колькасцю у 278 найменняў. Агульны аб'ём дысертацыі складае 115 старонак, з іх бібліяграфія займае 17 старонак.

## Асноўны змест дысертацыі

У першым раздзеле "Гістарыяграфія, крыніцы, метадалогія і метады даследавання" разглядаецца стан распрацоўкі праблемы і аналізуюцца крыніцы даследавання.

**Базу крыніц дысертацыі** складаюць дакументы, якія падзяляюцца на касцёльныя і дзяржаўныя. Наш агляд пачынаецца з касцёльных дакументаў. Перш за ўсё гэта дакументы, сабраныя даследчыкам П. Раіна ў 3-хтомным зборніку "Касцёл у ПНР. Каталіцкі Касцёл і дзяржава ў святле дакументаў 1945–1989"[1]. Крыніцы, прадстаўленыя ў зборніку,

[1] Kościół w PRL. Kościół Katolicki a państwo w świetle dokumentów 1945 – 1989. – W 3 t. – Poznań – Pelplin: W drodze – Bernardinum, 1994 – 1996. – T. 1–3.

падзяляюцца на некалькі груп: 1) камюніке Пленарных Канферэнцый Біскупату Польшчы; 2) лісты і мемарандумы Біскупату Польшчы да прадстаўнікоў урада; 3) лісты прадстаўнікоў урада да Біскупату Польшчы; 4) непасрэдна дакументы Касцёла – пастырскія пасланні да вернікаў, прамовы прадстаўнікоў вышэйшай касцёльнай іерархіі, у тым ліку і Папы; 5) некаторыя заканадаўчыя акты, што рэгулявалі прававое становішча Касцёла ў ПНР. Гэтыя дакументы складаюць вельмі каштоўны матэрыял для разумення ролі і месца Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР пасля другой сусветнай вайны.

Становішча Касцёла, яго пазіцыю і ролю ў дапамозе грамадству падчас перыяду ваеннага становішча асвятляюць дакументы, прадстаўленыя ў зборніках "Ян Павел II, Прымас і Біскупат Польшчы аб ваенным становішчы"[1] і "Касцёл у Польшчы 1981 – 1984"[2].

Вялікае значэнне для разумення пазіцыі Касцёла ў многіх пытаннях грамадска-палітычнага жыцця маюць пастырскія пасланні Біскупату Польшчы[3], прымасаў Вышыньскага[4] і Глемпа[5], іх пропаведзі і выказванні, прамовы Папы Яна Паўла II падчас яго візітаў у ПНР[6].

Вельмі істотнымі крыніцамі з'яўляюцца дзяржаўныя дакументы, перш за ўсё справаздачы з пасяджэнняў Сумеснай Камісіі прадстаўнікоў урада і Біскупату[7], а таксама пратаколы з пасяджэнняў Камітэту ў справах кліру пры Адміністрацыйным аддзеле ЦК ПАРП, нататкі і інфармацыі Адміністрацыйнага аддзелу ЦК ПАРП [8].

Пазіцыю Касцёла падчас крызісаў 1970 і 1976 г. высвятляюць некаторыя дакументы Міністэрства Унутраных Спраў і Палітычнага Бюро ЦК ПАРП – нататкі з пасяджэнняў Штабу і інфармацыі аб сітуацыі ў краіне[9]. Пэўную інфармацыю аб дзейнасці Касцёла ў 1980 – 1981 гг. і 1988 – 1989 гг. даюць дакументы Палітычнага Бюро і Сакратарыяту ЦК ПАРП[10]. Вельмі каштоўная інфармацыя аб адносінах Касцёла і дзяржавы ў 1970 – 1980 гг. прадстаўлена ў пратаколах сустрэч сакратара Біскупату Польшчы біскупа Дамброўскага з прадстаўнікамі вышэйшых уладаў краіны[11]. Рознага роду прававыя акты, якія рэгулявалі дзейнасць Касцёла ў ПНР, а таксама яго становішча, прадстаўлены ў зборніках

---

[1] Jan Paweł II, Prymas i Episkopat Polski o stanie wojennym. Kazania, listy, przemówienia i komunikaty. – Londyn: Oficyna poetów i malarzy, 1982. – 316 s.
[2] Kościół w Polsce. 1981 – 1984. – Londyn: Katolicki ośrodek wydawniczy "Veritas", 1985. – 382 s.
[3] Listy pasterskie Episkopatu Polski 1945 – 1974. – Paris: Editions du Dialogue, 1975. – 848 s.
[4] Prymas Tysiąclecia. – Paryż: Editions du Dialogue, 1982. – 288 s.
[5] Glemp J., Kardynał. Chcemy z tego sprawdzianu wyjść prawdomówni i wiarygodni. Myśl społeczna Kościoła w nauczaniu Prymasa Polski. 1981–1983. – Warszawa: Wydawnictwo Archidiecezji Warszawskiej, 1985. – 208 s.
[6] Jan Paweł II. Nauczanie Społeczne. Pielgrzymka do Polski 1979. – Warszawa: Ośrodek dokumentacji i Studiów Społecznych,1982. – 228 s. Druga pielgrzymka Jana Pawła II do ojczyzny 16 – 23. VI. 1983. – Warszawa: Instytut wydawniczy PAX, 1983. – 336 s. Jan Paweł II. Trzecia pielgrzymka do Polski. Przemówienia. Homilie. 9. VI. 1987. – 14. VI. 1987. – Kraków: Znak, 1987. – 230 s.
[7] Tajne dokumenty Państwo – Kościół 1960 – 1980. – Londyn: Aneks, 1996. – 462 s.
[8] Tajne dokumenty Państwo – Kościół 1980 – 1989. – Londyn: Aneks, 1993. – 594 s.
[9] Grudzień 1970 w dokumentach MSW. – Warszawa: Dom Wydawniczy "Bellona", 2000. – 235 s. Tajne dokumenty Biura Politycznego. Grudzień 1970. – Londyn: Aneks, 1991. – 474 s. Czerwiec 1976 w materiałach archiwalnych. – Warszawa: Oficyna Wydawnicza VOLUMEN, 2001. – 279 s.
[10] Tajne dokumenty Biura Politycznego. PZPR a "Solidarność". 1980 – 1981. – Londyn: Aneks, 1992. – 672 s. Tajne dokumenty Biura Politycznego i Sekretariatu KC. Ostatni rok władzy. 1988 – 1989. – Londyn: Aneks, 1994. – 490 s.
[11] Rozmowy z władzami PRL. Arcybiskup Dąbrowski w służbie Kościoła i narodu. – W 2 t. – Warszawa: Książka Polska, 1995. – T. 1 – 2.

"Адносіны Дзяржавы і Касцёла ў 1944 – 1987 гг."[1], "Прававое рэгуляванне веравызнаўчых адносін у Польшчы"[2].

У дысертацыі шырока выкарыстаны перыядычны друк, які прадстаўляе сабой вельмі аб'ёмны і важны крыніцазнаўчы матэрыял. У гэтай сувязі асабліва каштоўнымі з'яўляюцца такія газеты, як "Tygodnik Powszechny", "Słowo Powszechne", польскае выданне "L'Osservatore Romano", часопіс "Chrześcjanin w świecie", выданне Прэс-Бюро Касцёла "Pismo Okólne".

Вялікае значэнне для разумення ролі Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці Польшчы мае мемуарная літаратура. Безумоўна, трэба мець на ўвазе, што мемуары ў пэўнай ступені носяць суб'ектыўны характар, але тым не менш яны дазваляюць глыбей зразумець працэсы і падзеі, што адбываліся ў ПНР. Па дадзенай праблеме ўспаміны прадстаўлены або ў дзённікавых запісах, ці ў форме інтэрв'ю. Звярталіся да іх такія дзяржаўныя дзеячы, як С. Каня[3], Э. Герэк[4], В. Ярузельскі[5], К. Конкаль[6], прадстаўнікі Касцёла – прымас Стэфан Вышыньскі[7], яго асабісты капелан Б. Пясэцкі[8], блізкія да касцёльных арганізацый людзі – Р. Кукаловіч[9], Р. Рэйф[10], прадстаўнікі апазіцыі і "Салідарнасці" – Л. Валенса[11], А. Халь[12], Я. Качыньскі[13], Б. Барусевіч, Ул. Фрасынюк, Т. Едынак, Б. Ліс, Э. Шумейка[14], Я. Курань[15].

**Гістарыяграфія.** У савецкай гістарыяграфіі ў пасляваенны перыяд закраналася толькі пытанне адносін паміж Касцёлам і дзяржавай. Больш увагі гэтай праблеме прысвячаецца ў 1980-х гг. Выходзяць манаграфіі Л. Ф. Шаўцовай[16], М. Е. Дабрускіна[17], рэфератыўны зборнік "Церковь в социалистических странах"[18].

Пытанне адносін паміж Касцёлам і "Салідарнасцю" закраналі В. Трубнікаў[19] і Я. Я. Грышын[1]. У артыкулах К. Хжаноўскага, Я. Каседоўскага, А. Жардзіна, у зборніку "Ка-

---

[1] Stosunki Państwo – Kościół w latach 1944 – 1987. (Wybór materiałów źródłowych). – Warszawa: Wojskowa Akademia Polityczna im. F. Dzierżyńskiego. Katedra Religioznaustwa i Etyki Marksistowskiej, 1988. – 306 s.
[2] Regulacje prawne stosunków wyznaniowych w Polsce. Zbiór przepisów i dokumentów (stan na 31 października 1992 r.). – Warszawa: Uniwersytet Warszawski, Instytut Nauk Politycznych, 1992. – 237 s.
[3] Kania S. Zatrzymac konfrontację. – Warszawa: Polska Oficyna Wydawnicza "BGW", 1992. – 304 s.
[4] Rolicki J. Edward Gierek: pzerwana dekada. – Warszawa: FAKT, 1990. – 204 s.
[5] Jaruzelski W. Stan wojenny. Dlaczego … – Warszawa: Polska Oficyna wydawnicza "BGW", 1992. – 437 s.
[6] Kąkol K. Spowiedź pogromcy Kościoła. – Olsztyn: ETHOS, 1994. – 196 s.
[7] Wyszyński S., Kardynał. Zapiski więzienne. – Paris: Editions du Dialogue, 1982. – 256 s.
[8] Piasecki B. Ostatnie dni Prymasa Tysiąclecia. – Rzym: Dom Polski Jana Pawła II w Rzymie, 1982. – 167 s.
[9] W cieniu Prymasa Tysiąclecia. Z Romualdem Kukołowiczem rozmawia Piotr Bączek. – Warszawa: Inicjatywa Wydawnicza "ad astra", 2001. – 283 s.
[10] Reiff R. Okrągły stół. – Warszawa: Wydawnictwo Grup Politycznych "WOLA", 1989. – 184 s.
[11] Wałęsa L. Droga do wolności. 1985 – 1990. Decydujące lata. -- Warszawa: Editions Spotkania, 1991. – 290 s. Wałęsa L. Droga nadziei. – Kraków: Znak, 1989. – 388 s.
[12] Spór o Polskę. Z Aleksandrem Hallem rozmawiają Ewa Polak i Mariusz Kobzej. – Warszawa: Oficyna Wydawnicza RYTM, 1993. – 143 s.
[13] Czas na zmiany. Z Jarosławem Kaczyńskim rozmawiają Michał Bichniewicz i Piotr M. Rudnicki. – Warszawa: Editions Spotkania, 1993. – 115 s.
[14] Łopiński M., Moskit M., Wilk M. Konspira. Rzecz o podziemnej "Solidarności". – Warszawa: Oficyna Wydawnicza "Modem", 1989. – 302 s.
[15] Kuroń J. Gwiezdny czas. "Wiary i winy" dalszy ciąg. – Londyn: Aneks, 1991. – 256 s.
[16] Шевцова Л. Ф. Социализм и католицизм. (Взаимоотношения государства и католической церкви в социалистических странах). – М.: "Наука", 1982. – 215 с.
[17] Добрускин М. Е. Религия и атеизм в европейских социалистических странах. – М.: "Наука", 1986. – 189 с.
[18] Церковь в социалистических странах: Реферативный сборник. / [Редкол.: Б.А. Филиппов (ред-сост.) и др.].– М.: ИНИОН, 1987. – 163 с.
[19] Трубников В. Крах "операции Полония" 1980 – 1981 гг. Докум. очерк. – Мн: Вышэйшая школа, 1984. – 246 с.

толическая церковь в ПНР в 80-х гг."[2] аналізуюцца адносіны Касцёла з "Салідарнасцю" і "Вясковай Салідарнасцю". Нягледзячы на тэндэнцыйнае асвятленне, вышэйназваныя аўтары лічаць, што Касцёл адыгрываў істотную ролю ў дзейнасці гэтых арганізацый.

У постсавецкай гістарыяграфіі даследчыкі звярталіся толькі да пытання адносін паміж Касцёлам і "Салідарнасцю". Так, гэтую праблему закранаюць у сваіх даследаваннях Я. Я. Грышын[3] і Б. А. Філіпаў[4]. І калі Грышын прытрымліваецца меркавання, што Касцёл і "Салідарнасць" не мелі блізкіх адносін, то Філіпаў, хаця і недаацэньвае ролі Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці, прытрымліваецца супрацьлеглай пазіцыі.

Вялікі ўклад у вывучэнне гісторыі Польшчы ў 1970 – 1990-х гг. у беларускай гістарыяграфіі ўнеслі такія вучоныя, як В. В. Бянькоўскі[5], Л. В. Лойка[6], М. Э. Часноўскі[7]. Перыяд 1970 – 1989 гг., які ахоплівае храналагічныя межы дысертацыі, вывучалі ў сваіх даследаваннях В. В. Бянькоўскі і Л. В. Лойка. У сваіх манаграфіях гэтыя аўтары даследавалі палітычныя працэсы, якія адбываліся на працягу 1970 – 1989 гг. у ПНР, дзякуючы чаму была створана трывалая канцэптуальная і факталагічная аснова для вывучэння ролі Каталіцкага Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР у разглядаемы перыяд. У гэтых даследаваннях яны закранулі і праблему ўзаемаадносін паміж дзяржавай і Касцёлам у 1970 – 1989 гг. і зрабілі вывад, што ў гэты перыяд Касцёл адыграў выключную ролю ў грамадска-палітычным жыцці краіны.

Цяпер пяройдзем да агляду польскай гістарыяграфіі. Да 1989 г. польскія даследчыкі ў асноўным звярталіся да праблемы адносін паміж Касцёлам і дзяржавай. Гэтае пытанне знайшло адбітак у працах Я. Валіцкага[8], Ф. Гадлеўскага[9], А. Пекарскага[10], С. Маркевіча[11], К. Конкаля[12]. Даследаванні вышэйназваных аўтараў утрымліваюць вялікі фактычны матэрыял, але істотным іх недахопам з'яўляецца аднабаковае асвятленне адносін паміж Касцёлам і дзяржавай.

Посткамуністычная гістарыяграфія Трэцяй Рэчы Паспалітай гэтую праблему разглядае па-іншаму. Найбольш даследаваным да нядаўняга часу быў перыяд да сярэдзіны 1950

---

[1] Гришин Я. Я. Происки контрреволюции и защита революционных завоеваний. – Казань: Издательство Казанского университета, 1989. – 199 с.

[2] Католическая церковь в ПНР в 80-х гг.: / Академия общественных наук при ЦК КПСС; [Редкол.: Л. Н. Великович ( отв. ред.) и др.]. – М.: АОН, 1988. – 225 с.

[3] Гришин Я.Я. Драматические события в Польше 1980 – 1981 гг. – Казань: Издательство Казанского университета, 1993. – 239 с.

[4] Филиппов Б.А. Политический портрет Леха Валенсы. – М.: Российская Академия Наук. Институт научной информации по общественным наукам, 1992. – 51 с.

[5] Беньковский В. В. Трансформация общества в Польше. – Мн.: НО ООО "БНП", 2002. – 345 с.

[6] Лойко Л. В.Политическая борьба в Польше ( 70 – 80 гг.). – Мн.: Завигар, Беларуская мінуўшчына, 1995. – 224 с. Лойко Л. В. Политическое развитие Польши в 70 – 80-е гг. Мн.: Бел. гос ун-т, 2002. – 227 с.

[7] Часноўскі М. Э. Сістэмныя пераўтварэнні ў Рэспубліцы Польшча ( 1989 – 1999). Мн.: БДУ, 2000. – 287 с.

[8] Walicki J. Wyznania w Polsce. – Warszawa: Interpress, 1970. – 81 s.

[9] Godlewski F. J. Kościół rzymskokatolicki w Polsce wobec sekularizacji życia publicznego ( 1944 – 1974). – Warszawa: PWN , 1978. – 357 s.

[10] Piekarski A. Szkice o Kościole w Polsce. Fakty – liczby – informacje. – Warszawa: Interpress, 1974. – 224 s.

[11] Markiewicz S. Państwo i Kościół w Polsce. – Warszawa: Krajowa Agencja Wydawnicza, 1984. – 271 s.

[12] Kąkol K. Kościół w PRL. Elementy ewolucji doktryny. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1985. – 296 s.

– 1960-х гг. У пераважнасці вывучэнню гэтага перыяду прысвечаны працы Я. Жарына[1], Б. Фіялкоўскай[2], Р. Грыза[3], А. Дудэка[4], П. Кандзелі[5].

Вялікі ўклад у вывучэнне ролі і месца ў грамадска-палітычным жыцці ПНР унеслі такія польскія даследчыкі, як А. Міцэўскі, А. Ануш, Я. Жарын. Адной з першых кніг А. Міцэўскага была біяграфія прымаса Вышыньскага, кіраўніка Каталіцкага Касцёла ў Польшчы ў 1948 – 1981 гг. "Кардынал Вышыньскі – прымас і дзяржаўны дзеяч"[6], у якой Міцэўскі апісвае дзейнасць прымаса ў кантэксце адносін паміж Касцёлам і дзяржавай у ПНР. Вельмі актуальную праблему ўзняў Міцэўскі ў даследаванні "Касцёл і яго адносіны да "Салідарнасці" і ваеннага становішча"[7], дзе зрабіў вывад аб вялікай ролі і ўплыве Касцёла на дзейнасць прафсаюза, а таксама на грамадска-палітычнае жыццё ПНР у 1980 – 1983 гг. Эвалюцыю адносін паміж Касцёлам і дзяржавай ў 1945 – 1989 гг. Міцэўскі апісвае ў навукова-папулярным выданні "Касцёл – дзяржава 1945 – 1989"[8]. Важным крокам на шляху навуковай распрацоўкі пытання аб удзеле Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР з'яўляюцца працы А. Ануша. У сваім першым даследаванні "Адзінокія сярод вернікаў. Адносіны Касцёла да палітычных змен у Польшчы (1944 – 1994 гг.)"[9] А. Ануш апісвае адносіны паміж Касцёлам і дзяржавай у 1944 – 1994 гг., адносіны Касцёла з палітычнай апазіцыяй і незалежным прафсаюзам "Салідарнасць", і ў меншай ступені яго дзейнасць падчас ваеннага становішча і ўдзел у грамадска-палітычных працэсах краіны ў другой палове 1980-х гг. У наступнай працы – "Прытулак. Касцёл і палітычная апазіцыя ў Польшчы ў 1976 – 1980 гг."[10] – ён першы даследуе вельмі цікавую праблему адносін паміж Касцёлам і палітычнай апазіцыяй у ПНР. У кнізе "Грамадзянскі Касцёл. Фарміраванне грамадства ПНР у перыяд паўстання незалежных палітычных інстытутаў (1976 – 1981)"[11] Ануш распрацаваў вельмі важную і абсалютна недаследаваную праблему ролі Касцёла ў фарміраванні грамадства ў ПНР. У сваіх працах Ануш робіць вывад аб вялікай ролі Касцёла ў грамадска-палітычных працэсах, якія адбываліся ў краіне.

Незвычайна каштоўным з'яўляецца даследаванне Я. Жарына "Гісторыя Каталіцкага Касцёла ў Польшчы (1944 – 1989 гг.)"[12], дзе аўтар дэталёва даследаваў адносіны паміж

---

[1] Żaryn J. Kościół a władza w Polsce (1945 – 1950). – Warszawa: DIG, 1997. – 388 s.
[2] Fijałkowska B. Partia wobec religii i Kościoła w PRL. – T. 1 – (1944 –1955). – Olsztyn: Uniwersitet Warmińsko-Mazurski, 1999. – 251 s.
[3] Gryz R. Państwo a Kościół w Polsce 1945 – 1956 na przykładzie województwa kielieckigo. – Kraków: Nomos, 1999. – 414 s.
[4] Dudek A. Państwo i Kościoł w Polsce 1945 – 1970. – Kraków: PiT, 1995. – 278 s.
[5] Kądziela P. Kościół a Państwo w Polsce 1945 – 1965. – Wrocław: Biblioteczka "Nowego Życia", 1990. – 80 s.
[6] Micewski A. Kardynał Wyszyński Prymas i mąż stanu. – Paris: Editions du Dialogue, 1987. – 469 s.
[7] Micewski A. Kościół wobec "Solidarności" i stanu wojennego. – Paris: Editions du Dialogue, 1987. – 285 s.
[8] *Micewski A. Kościół – Panstwo. 1945 –1989.* – Warszawa: Wydawnictwo Szkolne i Pedagogiczne, 1994. – 88 s.
[9] Anusz A., Anusz A. Samotnie wśród wiernych. Kościoł wobec przemian politycznych w Polsce. (1944 – 1994). – Warszawa: Alfa, 1994. – 296 s.
[10] Anusz A. Przytulisko. Kościół Katolicki wobec opozycji politycznej w Polsce w latach 1976 – 1980. – Warszawa: Agencja Wydawnicza i Reklamowa „Akces", *2001. – 156* s.
[11] Anusz A. Kościół obywatelski. Formowanie społeczeństwa obywatelskiego w PRL w okresie powstania niezależnych instytucji politycznych (1976 – 1981). – Warszawa: Agencja Wydawnicza i Reklamowa „Akces", 2004. – 506 s.
[12] Żaryn J. Dzieje Kościoła Katolickiego w Polsce (1944 – 1989). – Warszawa: Neriton, 2003. – 635 s.

Касцёлам і дзяржавай, Касцёлам і "Салідарнасцю", удзел Касцёла ў грамадска-палітычных працэсах у ПНР пасля другой сусветнай вайны.

Праблему адносін паміж Касцёлам і "Салідарнасцю", яго дзейнасць ва ўмовах ваеннага становішча распрацоўвалі ў сваіх працах П. Нітэцкі[1], Е. Хользер[2], Р. Рэйф[3].

Да пытання ўдзелу Каталіцкага Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР звярталіся таксама англійскія і французскія даследчыкі. У сваіх працах яны разглядалі адносіны паміж Касцёлам і "Салідарнасцю", дзяржавай і Касцёлам у 1980 -1981 гг., дзейнасць Касцёла ў перыяд ваеннага становішча. Гэтыя праблемы закранулі Я. Вейдэнтал і іншыя[4], Ц. Г. Эш[5], Л. Гудвін[6], А. Турайн і іншыя[7]. Вялікую цікавасць праявілі замежныя даследчыкі да асобы Папы Яна Паўла II, што выявілася ў велізарнай колькасці даследаванняў аб яго жыцці і дзейнасці. Вельмі каштоўнымі з'яўляюцца біяграфіі аўтарства Т. Шульца[8] і Дж. Вейгеля[9]. Гэтыя аўтары лічаць, што Папа Ян Павел II у 1970 - 1980-х гг. аказваў вялікі ўплыў на падзеі гэтага перыяду.

Такім чынам, гістарыяграфічны агляд сведчыць аб тым, што намаганнямі гісторыкаў створана значная колькасць змястоўных у навуковым плане работ. Аднак не існуе ніводнага комплекснага даследавання, прысвечанага ролі Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР 1970 – 1989 гг. У выніку, актуальнасць і недастатковае асвятленне патрабуюць далейшай распрацоўкі праблемы.

Другі раздзел **"Касцёл і польскае грамадства ў 1970-я гг."** складаецца з чатырох параграфаў і ў ім разглядаецца дзейнасць Касцёла, яго адносіны з дзяржавай, грамадствам і апазіцыяй у 1970-я гг.

2.1. У параграфе асвятляюцца адносіны паміж Касцёлам і дзяржавай у 1944 – 1969 гг. Гэты перыяд выходзіць за храналагічныя межы дысертацыйнага даследавання, але каб зразумець сутнасць працэсаў, якія адбываліся ў 1970 - 1989 гг., неабходна звярнуцца да падзей менавіта тых часоў. Другая сусветная вайна прынесла змены ў грамадска-палітычны лад Польшчы, што паўплывала на становішча Каталіцкага Касцёла. Ужо 12 верасня 1945 г. новы ўрад у аднабаковым парадку разарваў канкардат з Ватыканам. Але ў цэлым перыяд да 1948 г. характарызуецца адносна мірным суіснаваннем Касцёла і дзяржавы. Больш таго, ураду прыходзілася лічыцца з пазіцыяй Касцёла. З 1948 г. пачынаецца перыяд выразнага наступлення на Касцёл. Каб захаваць свае пазіцыі, Касцёл ідзе на падпісанне ў 1950 г. беспрэцэдэнтнага ў гісторыі пагаднення паміж Касцёлам і камуністычным урадам. Але урад працягвае палітыку канфрантацыі з Касцёлам, што заканчваецца арыштам прымаса Вышынэскага ў 1953 г. У выніку, застаўшыся без свайго

---

[1] Nitecki P. Kościół, "Solidarnośc" i odnowa społeczna w Polsce. – Warszawa: Ośrodek Dokumentacji i Studiów Społecznych, 1991. – 307 s.

[2] Holzer J. „Solidarność" 1980 – 1981. Geneza i historia. – Warszawa: Krąg, 1984. – 244 s.

[3] Reiff R. Czas "Solidarności". – Warszawa: Editions Spotkania, 1988. – 336 s.

[4] Wejdental Jan B. de, Porter B. D. Devlin K. Polski dramat 1980 – 1982. – Warszawa: Oficyna Wydawnicza RYTM, 1991. – 512 s.

[5] Ash T. G. Polska rewolucja. "Solidarność" 1980 – 1981. – Londyn: Polonia, 1987. – 224 s.

[6] Goodwyn L. Jak to zrobiliście? Powstanie "Solidarności" w Polsce. – Gdańsk: Krajowa Agencja Wydawnicza, 1992. – 627 s.

[7] Touraine A., Strzelecki J., Dubet F., Wieviorka M. Solidarność: analiza ruchu społecznego 1980 – 1981. – Warszawa: Europa, 1989. – 184 s.

[8] Вейгел Дж. Свидетель надежды. Иоанн Павел II. В 2–х кн. – М.: ООО "Издательство АСТ", 2001. Кн. 1, 2.

[9] Шульц Т. Иоанн Павел II. – Минск: Попурри, 2000. – 640 с.

кіраўніка, у 1953 – 1956 гг. Касцёл праводзіць больш згодніцкую палітыку, чым у папярэдні перыяд. Але і Уладыслаў Гамулка ў 1956 г. з мэтай павелічэння свайго аўтарытэту ідзе на прымірэнняе з Касцёлам. Аднак перыяд "адлігі," падчас якога Касцёл усяляк падтрымліваў урадавыя ініцыятывы, быў вельмі непрацяглым, і з 1958 г. пачынаецца новы віток канфрантацыі. Тым часам Касцёл, пазбаўлены сваіх перадваенных саюзнікаў, змяняе сваю арыентацыю і пераходзіць да абароны правоў чалавека, што павялічвае яго аўтарытэт у грамадстве. Вельмі сур'ёзнай заявай польскага Касцёла стала "Пасланне польскіх біскупаў да іх нямецкіх братоў у Хрысце", у якім польскі Біскупат дараваў нямецкаму народу крыўды, нанесеныя палякам, і ў сваю чаргу прасіў прабачэння ў іх. У 1968 г. Касцёл падтрымаў студэнцкія выступленні і асудзіў іх разгон.

2.2. Параграф прысвечаны разгляду адносін паміж Касцёлам і дзяржавай у 1970-я гг. У выніку крызісу 1970 г. пачынаецца новы этап у адносінах Касцёла і дзяржавы. Кіраўніцтва ПАРП абвяшчае аб імкненні дзяржавы да поўнай нармалізацыі адносін з Касцёлам. Аднак гэты працэс па-рознаму разумелі абодва бакі, што прыводзіла да непаразуменняў паміж імі. Тым не менш, найважнейшым пачынаннем стала ўрэгуляванне пытання касцёльнай уласнасці на Заходніх землях. На працягу 1970-х гг. прасочваецца і выразнае змяненне адносін кіраўніцтва ПАРП і МУС да прымаса Вышынськага: іх адносіны да яго становяцца больш прыхільнымі. У 1975 г. у краіне пачаліся прыгатаванні да рэформы Канстытуцыі. У выніку пратэстаў грамадства і Касцёла, у Канстытуцыю не былі ўнесены непажаданыя для ПНР змены. Такім чынам, на пачатку 1976 г. Касцёл прадэманстраваў свае магчымасці і сілу, што вымушала лічыцца з яго пазіцыяй. Вялікі клопат праяўляў Касцёл аб нармальным развіцці грамадства, сям'і, а таксама выхаванні дзяцей і моладзі, пра што сведчаць шматлікія мемарандумы і лісты, накіраваныя да ўладаў ПНР. Звяртаўся Касцёл і да праблем сацыяльна-эканамічнага характару.

Свой уплыў Касцёл прадэманстраваў і падчас крызісу 1976 г. Няма сумнення, што націск Касцёла адыграў вялікую ролю ў схіленні ўладаў ПНР да амністыі ў 1977 г. удзельнікаў чэрвеньскіх падзей 1976 г. Другая палова 1970-х гг. характарызавалася ўсё больш нарастаючым эканамічным крызісам і развіццём палітычнай апазіцыі. У такіх умовах улады стараліся схіліць на свой бок Касцёл і прадэманстраваць бачнасць бесканфліктнага суіснавання. Таму ў гэты перыяд ўлады імкнуліся пазбягаць адкрытых канфліктаў з Касцёлам, лавіруючы паміж механізмамі, што абмяжоўвалі дзейнасць Касцёла, і неабходнасцю ўступак.

2.3. У параграфе асвятляюцца адносіны паміж Касцёлам і апазіцыяй. Другая палова 1970-х гг. у ПНР характарызуецца нараджэннем палітычнай апазіцыі. На афіцыйным узроўні Касцёл не супрацоўнічаў з апазіцыйнымі арганізацыямі, што не азначала поўнай адасобленасці абодвух бакоў. Так, напрыклад, тайная апазіцыйная арганізацыя – Польскае Незалежнае Паразуменне ўтрымлівала кантакт з прымасам Вышынськім праз яго капелана, ксяндза Браніслава Пясэцкага. Але пры гэтым прымас Вышынські давяраў не ўсім апазіцыйным арганізацыям, бо некаторыя лідэры новай апазіцыі выйшлі з урадавых колаў, былі апазіцыйнымі неафітамі, мелі чыста палітычныя амбіцыі і праяўлялі вялікі грамадскі радыкалізм, многія з іх былі атэістамі. Усё гэта і паўплывала на тое, што прымас захоўваў дыстанцыю. Аднак ён ніколі афіцыйна не крытыкаваў апазіцыю. Пры гэтым прымас ніколі не адмаўляўся ўмешвацца ў справы арыштаваных і рэпрэсаваных апазіцыянераў. Так, на пачатку 1974 г. прымас Вышынські і Кракаўскі мітрапаліт кардыс

нал Вайтыла падтрымалі просьбу аб амністыі братоў Чумаў, лідэраў тайнай арганізацыі "Рух", накіраваную іх маці ў Дзяржаўны Савет. Касцёл дапамагаў апазіцыянерам і матэрыяльна. Напрыклад, беспрацоўны рабочы Лех Валенса атрымліваў фінансавую дапамогу не толькі ад КАРу і РАПЧГ, але і з каталіцкіх крыніц. Прымас Вышыньскі абараняў дзейнасць Перасоўнага універсітэта, створанага па ініцыятыве КАРу, Касцёл прадстаўляў памяшканні, а некаторыя ксяндзы выступалі ў якасці выкладчыкаў. Прадстаўнікі каталіцкага духавенства ўступалі ў тайныя арганізацыі, некаторыя з іх вельмі актыўна друкаваліся ў апазіцыйных пазацэнзурных выданнях. Аднак Касцёл ніколі не караў ксяндзоў, якія бралі ўдзел у дысідэнцкай дзейнасці. Трэба падкрэсліць, што дзеянні дзяржавы і органаў бяспекі ў адносінах да апазіцыі прыводзілі да новых форм яе ўзаемадзеянняў з Касцёлам. Усе тры пратэстацыйныя галадоўкі КАРу ( адна ў 1977 г. і дзве ў 1979 г. ) адбыліся ў памяшканнях касцёлаў. У гэтых галадоўках прымалі ўдзел і прадстаўнікі каталіцкага духавенства.

2.4. Параграф прысвечаны абранню і першаму візіту Папы Яна Паўла II у ПНР і асвятляе рэакцыю польскага ўрада і грамадства на гэтыя падзеі.

16 кастрычніка 1978 г. Папам Рымскім быў абраны паляк, Кракаўскі мітрапаліт Караль Вайтыла, які ўзяў сабе імя Ян Павел II. Гэта стала вялікім поспехам для польскага Касцёла, ранг якога павысіўся як на міжнароднай арэне, так і ва ўнутраных адносінах з дзяржавай, і вялікай праблемай для прадстаўнікоў урада. Улады Варшавы і Масквы разумелі, што абранне Вайтылы Папам можа прадстаўляць сур'ёзную пагрозу для стабільнасці ўсёй камуністычнай сістэмы. Акрамя гэтага чакалася, што палітычная ўвага Папы сканцэнтруецца ў першую чаргу на роднай краіне. Аднак, нягледзячы на гэта, польскія ўлады дэманстравалі поўную лаяльнасць да новага Папы. Яму была даслана віншавальная тэлеграма, якую падпісалі Э. Герэк, Першы сакратар ЦК ПАРП, Г. Яблоньскі, старшыня Дзяржаўнага Савета ПНР, і П. Ярашэвіч, прэм'ер-міністр. На інаўгурацыі Папы прысутнічала і дэлегацыя ад польскага ўрада. Аднак пры гэтым польскі ўрад не дазволіў прыехаць Папу ў Польшчу ў маі 1979 г. – на свята святога Станіслава, які для палякаў быў сімвалам пакутніцтва Касцёла ад дзяржаўнай улады. Аднначасова афіцыйна Папа быў запрошаны толькі польскім Біскупатам. Гэта дазволіла польскім уладам пазбегнуць незадаволенасці Масквы, калі б Папа быў запрошаны імі, але аднначасова і захаваць твар перад польскім грамадствам і каталіцкім светам.

Першы візіт Папы Яна Паўла II у ПНР адбыўся 2 – 10 чэрвеня 1979 г. У мерапрыемствах, якія праводзіліся падчас пілігрымкі, прынялі ўдзел не менш за 10 мільёнаў чалавек. Пра тыя дні палякі гаварылі як пра "нашыя дзевяць дзён свабоды". У сваіх выступленнях Папа неаднаразова ўздымаў праблемы, актуальныя для ПНР, – пытанне правоў чалавека і нармалізацыі адносін паміж Касцёлам і дзяржавай. Сітуацыя, якая склалася ў Польшчы, была выключнай. Гэта выдатна разумеў Папа, а таксама і тое, у якім становішчы знаходзіліся польскія ўлады, заўсёды залежныя ад Масквы.

Трэці раздзел **"Касцёл ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага крызісу 1980-х гг."** складаецца з чатырох параграфаў і ў ім разглядаецца дзейнасць Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР у 1980-я гг.

3.1. У параграфе асвятляецца пазіцыя Касцёла падчас забастовак рабочых на Узбярэжжы ў жніўні 1980 г. У жніўні 1980 г. эпіцэнтр забастовачнай барацьбы ў сувязі з павышэннем цэн на прадукты харчавання перамясціўся на Балтыйскае узбярэжжа. Пад-

час гэтых забастовак рабочыя звярнуліся да рэлігійнай традыцыі, што выяўлялася ва ўдзеле ў імшы, штодзённых вечаровых малітвах, спяванні рэлігійных песень і размяшчэнні на тэрыторыі фабрык рэлігійных сімвалаў. Нядзельныя службы праводзіліся ў Гданьску, Гдыні і Шчэціне. Гэта яшчэ больш паглыбіла існуючыя раней кантакты паміж арганізаванымі групамі рабочых і іх душпастырамі, для якіх гэта стала не толькі новай формай душпастырскай дзейнасці, але і прадвызначыла іх удзел (г. зн. прадстаўнікоў Касцёла) у палітычнай дзейнасці.

Прымас накіраваў сваіх дарадцаў у Гданьск і Гдыню, каб яны дапамагалі рабочым весці перамовы з уладамі. Ардынарыі дыяцэзій, на тэрыторыі якіх праходзілі забастоўкі, у сваіх пасланнях падтрымалі бастуючых. Аднак вельмі неадназначным было выказванне прымаса аб сітуацыі ў краіне ў пропаведзі 26 жніўня на Яснай Гуры, у якой ён усклаў адказнасць за гэтую сітуацыю як на ўлады, так і на рабочых. І хаця ў пропаведзі не было прамых абвінавачванняў у адрас бастуючых, аднак грамадствам выказванне прымаса было ўспрынята са змешанымі пачуццямі і з думкай, што прымас не выказаўся цвёрда ў падтрымку забастоўкі. Але ў той жа дзень Галоўная Рада Біскупату Польшчы выдала камюніке, якое утрымлівала бескампрамісную падтрымку патрабаванняў рабочых. Увесь гэты час трымаў сітуацыю пад кантролем і Ян Павел II. Аналіз папскіх выказванняў і пасланняў паказвае, што ён таксама падтрымліваў пратэсты рабочых.

3.2. Параграф прысвечаны аналізу адносін паміж Касцёлам і дзяржавай у 1980 –1981 гг.

Ад жніўня 1980 г. пачынаецца новы, наступны этап у адносінах Касцёла і дзяржавы ў ПНР. У выніку грамадска-палітычнага крызісу збанкрутаваныя ўлады пачалі шукаць падтрымкі Касцёла для змяншэння напружанасці сітуацыі і сталі ўспрымаць яго не як праціўніка, а як партнёра і пасрэдніка ў адносінах з грамадствам. Ад жніўня 1980 г. вырашэнне ўсялякага грамадскага канфлікту адбывалася з удзелам Каталіцкага Касцёла і кожны раз суправаджалася кантактамі прадстаўнікоў урада з прымасам Вышыньскім, а потым і Глемпам. Напрыклад, за перыяд ад жніўня 1980 г. да лютага 1981 г. прымас Вышыньскі меў 8 сустрэч з прадстаўнікамі ўрада.

Супрацоўніцтва з урадам у пэўнай меры палегчыла становішча Касцёла і прывяло да адраджэння дзейнасці Сумеснай Камісіі прадстаўнікоў урада і Біскупату. Аднак Касцёл, як і раней, заставаўся праціўнікам камуністычнай сістэмы і яе ідэалогіі. Галоўным матывам усіх дзеянняў Касцёла ў 1980 – 1981 гг. быў клопат аб захаванні спакою ў грамадска-палітычным жыцці краіны, каб пазбегнуць палітычнай катастрофы і тым самым сітуацыі, у якой незалежнасць ПНР аказалася бы пад пагрозай. Пацвярджаюць гэта неаднаразовыя выказванні як Канферэнцыі Біскупату, так і асабіста прымаса. Сітуацыя ў краіне была прадметам абмеркавання практычна на ўсіх Пленарных Канферэнцыях Біскупату.

Наступнік Вышыньскага, прымас Глемп, працягваў палітыку дыялогу і супрацоўніцтва з уладамі. Менавіта Касцёл выступіў пасрэднікам у сустрэчы "вялікай тройкі" прымаса Глемпа, Войцеха Ярузельскага і старшыні "Салідарнасці" Леха Валенсы 4 лістапада 1981 г., якая была задумана як крок да фарміравання фронту нацыянальнага адзінства ў сітуацыі эскалацыі напружанасці паміж ПАРП і "Салідарнасцю".

3.3. Параграф асвятляе адносіны паміж Касцёлам і незалежным прафсаюзам "Салідарнасць".

Каталіцкі Касцёл у значнай ступені паспрыяў узнікненню "Салідарнасці", таму і пад-

трымлівaў прафсаюз, што выразна выявілася у перыяд яго "крызісу рэгістрацыі". Адной з формаў падтрымкі Касцёлам прафсаюза былі спатканні дзеячаў "Салідарнасці" з прадстаўнікамі вышэйшай касцёльнай іерархіі. Першая сустрэча Л. Валенсы з прымасам Вышыньскім адбылася ўжо 6 верасня 1980 г. У многіх рэгіёнах "Салідарнасці" дапамагалі эксперты, якіх рэкамендавалі дыяцэзіяльныя курыі.

Аб прыхільных адносінах Касцёла да прафсаюза сведчыць змест практычна ўсіх камюніке Пленарных Канферэнцый Біскупату Польшчы за перыяд легальнага існавання "Салідарнасці" і тое, што 9 снежня 1980 г. Біскупатам было ўтворана "Аб'яднанне для распрацоўкі праблем у сферы грамадскага каталіцкага навучання для прафсаюзнага руху пры Сакратарыяце Біскупату Польшчы", каб дапамагчы ва ўтварэнні ідэйнай платформы новага прафсаюза на падставе рэлігійнай і нацыянальнай традыцыі. Але пры ўсёй сваёй прыхільнасці да новапаўсталага прафсаюза прымас імкнуўся кантраляваць яго дзейнасць. Аднак пры такіх сувязях Касцёл толькі адзін раз умяшаўся ў канфлікт (і толькі ў якасці пасрэдніка) прафсаюза з уладай у Бельска-Бялэй. Вельмі сур'ёзна адрэагаваў Касцёл на "быдгаскі крызіс".

Радавое каталіцкае духавенства практычна цалкам падтрымлівала "Салідарнасць" – вельмі многія яго прадстаўнікі прымалі ўдзел у дзейнасці прафсаюза і, такім чынам, у палітычнай дзейнасці. У выніку ў сакавіку 1981 г. Біскупат Польшчы нагадаў каталіцкаму духавенству аб тым, што палітычная дзейнасць з'яўляецца задачай свецкіх католікаў.

Пасля смерці прымаса Вышыньскага ў маі 1981 г. адносіны паміж Касцёлам і "Салідарнасцю" змяніліся. Уплыў Касцёла на "Салідарнасць" выразна змяншаецца. Новы прымас, арцыбіскуп Глемп, стараўся адасобіць інтарэсы Касцёла і прафсаюза. Самі дзеячы "Салідарнасці" выразна дэманстравалі незалежнасць сваёй пазіцыі ад Касцёла, а таксама нежаданне яго непасрэднага ўмяшальніцтва ў палітычныя справы. Аднак гэта не азначала поўнай адасобленасці абодвух бакоў. Л. Валенса ўдзел у спатканні "вялікай тройкі" Ярузельскі – Валенса – Глемп узяў пад уплывам Касцёла. Апошнія сустрэчы старшыні "Салідарнасці" Валенсы і яго дарадцаў з прымасам Глемпам у сітуацыі пагрозы ўвядзення ваеннага становішча адбыліся 5, 7 і 9 снежня. Аднак спыніць працэс аказалася немагчымым. У выніку абвяшчэння ваеннага становішча дзейнасць "Салідарнасці" была забаронена і пачаўся падпольны этап у яе дзейнасці.

3.4. Параграф прысвечаны разгляду дзейнасці Касцёла падчас перыяду ваеннага становішча.

Каталіцкі Касцёл негатыўна ўспрыняў увядзенне ваеннага становішча. Адначасова прымас Глемп пазбягаў выразнай крытыкі дзеянняў уладаў і стараўся суцішыць настроі грамадства. З першых дзён увядзення ваеннага становішча Касцёл актыўна ўключыўся ў дзейнасць па дапамозе інтэрніраваным і іх сем'ям. Ужо 13 снежня быў створаны Камітэт у справах апекі над інтэрніраванымі. Акрамя гэтага, прымас Глемп і біскуп Дамброўскі неаднаразова дасылалі лісты да прадстаўнікоў урада, якія датычыліся праблем інтэрніраваных і правоў чалавека ва ўмовах ваеннага становішча. На працягу гэтага перыяду Касцёл дамагаўся ва ўладаў узнаўлення дзейнасці "Салідарнасці" і вызвалення Л. Валенсы, а таксама дамогся, каб падчас інтэрніравання Валенсы адбываліся яго кантакты з прадстаўнікамі Касцёла. Падчас ваеннага становішча Касцёл аказаў маральную і матэрыяльную падтрымку апазіцыі. Увядзенне ваеннага становішча выклікала непакой і ў Папы Яна Паўла II. На працягу гэтага перыяду Папа прысвяціў шмат часу і ўвагі сітуацыі

ў ПНР. Сваю лінію паводзін Прымас фармаваў у цесным паразуменні з Папам. Біскупат Польшчы рабіў усё, каб дабіцца згоды паміж урадам і грамадствам, але адначасова рэзка рэагаваў на супрацьпраўныя дзеянні ўладаў. Сітуацыя ў краіне была прадметам абмеркавання практычна на ўсіх пасяджэннях Пленарных Канферэнцый Біскупату на працягу перыяду ваеннага становішча. З увядзеннем ваеннага становішча не перапыняліся кантакты паміж прадстаўнікамі Біскупату і урада. Рэгулярна праводзіліся пасяджэнні Сумеснай Камісіі.

У чэрвені 1983 г. адбыўся другі візіт Папы ў ПНР. На пачатку візіту былі выразна бачны негатыўныя адносіны Папы да ваеннага становішча. Ва ўмовах сацыяльнага напружання ўрад пастараўся максімальна выкарыстаць гэты візіт, прыкладам чаму служыць другое, напачатку незапланаванае спатканне Папы з прэм'ерам Ярузельскім, што было зроблена ўрадам у процівагу сустрэчы Папы з Валенсам, бо ўрад усяляк гэтаму супраціўляўся. І хаця Папа сустрэўся не з былым кіраўніком "Салідарнасці", а з грамадзянінам Валенсам, і па-за межамі афіцыйнай праграмы, аднак гэтым самым Папа зноў падтрымаў "Салідарнасць" у вачах польскага грамадства, што паўплывала на актывізацыю апазіцыі ў краіне.

3.5. У параграфе разглядаецца грамадска-палітычная дзейнасць Касцёла ў другой палове 1980-х гг. Адмена ваеннага становішча не прынесла практычна ніякіх змен у адносіны паміж Касцёлам і дзяржавай. Як і раней, у сферы інтарэсаў Касцёла заставалася грамадскае жыццё краіны.

У чэрвені 1987 г. Папа трэці раз наведаў ПНР. Гэты візіт, як і першы, прывёў да кардынальнага змянення грамадска-палітычнай сітуацыі ў ПНР. У 1988 г. у многіх мясцінах пачаліся забастоўкі, арганізаваныя "Салідарнасцю" і Незалежным Аб'яднаннем Студэнтаў. Пасрэднікам у перамовах забастоўшчыкаў з уладамі зноў выступіў Касцёл. У гэтай цяжкай грамадска-палітычнай сітуацыі ва ўладаў узнікае ідэя правядзення "круглага стала" з удзелам апазіцыі. У перамовах урада і апазіцыі, як афіцыйных, так і неафіцыйных, прымалі ўдзел і прадстаўнікі Касцёла. Падчас падрыхтоўкі да "круглага стала" Касцёл неаднаразова ўздымаў пытанне аб узнаўленні дзейнасці "Салідарнасці".

У ходзе падрыхтоўкі перамоваў урад пачаў абмяркоўваць з Біскупатам пытанне аб магчымасці правядзення ў 1989 г. пазачарговых парламенцкіх выбараў, за шэсць месяцаў да ўстаноўленага тэрміну, што прадэманстравала прызнанне ўладамі Касцёла паўнапраўным партнёрам у вядзенні ўсіх спраў у краіне.

Падчас пасяджэнняў "круглага стала" Біскупат заставаўся ў цені, аднак актыўна ўдзельнічаў у рабочых спатканнях у Магдаленцы, якія адбываліся на працягу гэтага перыяду. У склад Паразумеваўчай камісіі, якая павінна была назіраць за выкананнем пастаноў "круглага стала", увайшлі і прадстаўнікі каталіцкага духавенства.

Вынікам "круглага стала" стала новае атрыманне юрыдычнага статусу "Салідарнасці" і ўрэгуляванне прававога статусу Касцёла ў краіне. 17 ліпеня 1989 г. былі ўзноўлены дыпламатычныя адносіны паміж польскім ўрадам і Ватыканам Яшчэ адным з вынікаў "круглага стала" было абвяшчэнне датэрміновых выбараў у Сейм і Сенат. Практычна ва ўсіх мясцінах парафіі ўключыліся ў выбарчую кампанію на карысць кандыдатаў ад апазіцыі. У выніку ўдзел Касцёла на ўзроўні парафіі не толькі стварыў апазіцыі арганізацыйную інфраструктуру, але і быў моцным фактарам уплыву на меркаванні і пазіцыю выбаршчыкаў. У вялікай меры дзякуючы дапамозе Касцёла апазіцыя атрымала ўсе сва-

бодныя месцы ў Сейме і 99 са 100 у Сенаце. Каля 1/3 кандыдатаў ад апазіцыі заявіла пра свае сувязі з інстытутамі Касцёла. Прэм'ерам стаў прадстаўнік апазіцыі Тадэвуш Мазавецкі, не апошнюю ролю ў гэтым адыграў Касцёл.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Калі перыяд 1944 – 1969 гг. характарызаваўся канфрантацыяй паміж Касцёлам і дзяржавай, то ў 1970 – 1980-х гг. адбываецца змяненне адносін паміж імі. У рамках гэтага перыяду выдзяляюцца два этапы – 1970-х гг. і 1980-х гг. У сувязі са снежаньскім крызісам 1970 г. урад імкнуўся да нармалізацыі адносін з Касцёлам, бо Э. Герэк разумеў згубнасць праводзімай палітыкі ўладаў у адносінах да яго. Аднак гэты працэс па-рознаму разумелі Касцёл і дзяржава, што ў вялікай меры прадвызначыла змест іх адносін. Імкненне ўладаў да нармалізацыі адносін з Касцёлам сведчыла аб вялікай ролі і аўтарытэце Касцёла. Касцёл у сваю чаргу імкнуўся да пашырэння сферы сваёй дзейнасці. Так, Касцёл рашуча пратэставаў супраць дзеянняў уладаў і выступіў у абарону рабочых падчас крызісаў 1970 г. і 1976 г. Менавіта Касцёл схіліў улады ПНР да амністыі ў 1977 г. удзельнікаў чэрвеньскіх падзей 1976 г. У вялікай меры дзякуючы намаганням Касцёла ў Канстытуцыю не былі ўнесены непажаданыя для польскага грамадства змены. Касцёл хвалявалі ўсе аспекты жыцця і дзейнасці чалавека ў польскім грамадстве.

Другі этап у адносінах паміж Касцёлам і дзяржавай пачаўся з 1980 г. У выніку сацыяльна-палітычнага крызісу 1980 г. сітуацыя ў ПНР радыкальна змянілася і адбылося ўзмацненне грамадскай пазіцыі Касцёла. ПАРП, хоць афіцыйна і заставалася кіраўнічай сілай, аднак, аслабленая крызісам, пачала страчваць свае пазіцыі ў грамадстве. Больш таго, збанкрутаваныя ўлады пачалі шукаць падтрымкі Касцёла ў змяншэнні напружанасці грамадска-палітычнай сітуацыі і сталі ўспрымаць яго не як праціўніка, а як партнёра і пасрэдніка ў адносінах з грамадствам. У выніку паглыбіліся адносіны паміж уладамі і Касцёлам, што выявілася найперш у рэгулярных спатканнях прадстаўнікоў урада з вышэйшай каталіцкай іерархіяй, перш за ўсё з прымасам Вышыньскім. Ад таго часу вырашэнне любога грамадскага крызісу ў краіне адбывалася з удзелам Каталіцкага Касцёла. Акрамя гэтага, Касцёл выконваў ролю пасрэдніка і мадэратара ў адносінах і кантактах урада з "Салідарнасцю", дапамагаючы ў вырашэнні многіх грамадскіх канфліктаў гэтага перыяду. Менавіта Касцёл дапамог у падрыхтоўцы і выступіў пасрэднікам у спатканні "вялікай тройкі" Ярузельскі – Валенса – Глемп [1, 9].

2. У другой палове 1970-х гг. адбылося збліжэнне свецкай інтэлектуальнай апазіцыі і касцёльнай іерархіі ў абароне асноўных гуманістычных каштоўнасцяў. Касцёл сваёй дзейнасцю ў абароне правоў чалавека і пашырэнні грамадскага плюралізму ў вялікай меры паспрыяў арганізацыйнаму афармленню палітычнай апазіцыі ў ПНР у гэты час. Аднак ніякім чынам нельга сцвярджаць аб сталым супрацоўніцтве Касцёла і палітычнай апазіцыі. З аднаго боку, назіраліся розныя формы ўзаемаадносін паміж імі, з другога – адрозніваліся адносіны радавога каталіцкага духавенства і кіраўніцтва Касцёла да розных плыняў апазіцыі. Так, калі пэўная колькасць радавога каталіцкага духавенства прыхільна ставілася да апазіцыйных арганізацый і нават уступала ў іх шэрагі (і такім чынам прымала непасрэдны ўдзел у іх дзейнасці), то ў адносінах да вышэйшай каталіцкай іерархіі можна гаварыць толькі аб рэдкіх кантактах. І калі для біскупа Такарчука гэта былі кантакты з

прадстаўнікамі апазіцыі, то для Прымаса Вышыньскага, кіраўніка Каталіцкага Касцёла, і кардынала Вайтылы – сустрэчы са сваёй паствай. Апазіцыя ў сваю чаргу імкнулася да супрацоўніцтва з Касцёлам і нават выкарыстання яго аўтарытэту ў сваёй палітычнай дзейнасці, чаму вышэйшая каталіцкая іерархія ўсяляк супраціўлялася. Але Касцёл падтрымліваў і нават ўдзельнічаў у акцыях апазіцыі асветніцкага і культурнага характару, напрыклад, Касцёл адыграў пэўную ролю ў дзейнасці Перасоўнага універсітэта [7].

3. Абранне Кракаўскага кардынала Вайтылы Папам у 1978 г. прывяло да змянення статусу Каталіцкага Касцёла ў ПНР і на міжнароднай арэне. Польскі Касцёл атрымаў вялікую падтрымку Папы, пачуццё сілы і недатыкальнасці. Выбар Яна Паўла II стварыў камуністычнай сістэме ПНР вялікія цяжкасці ў абмежаванні дзейнасці Касцёла, ўзняў усплёск рэлігійных пачуццяў і даў больш духоўнай незалежнасці польскаму грамадству ад камуністычнай улады, што асабліва выявілася падчас першага візіту ў ПНР Яна Паўла II. У сітуацыі асаблівага напружвання і ўзмацнення патрыятычных настрояў абранне і першы візіт Папы ў ПНР сталі адным з фактараў, што прывёў да "жніўня 1980" [2].

4. У перыяд жнівеньскага крызісу 1980 г. Касцёл выразна падтрымаў пратэсты рабочых. Можна выдзеліць дзве формы падтрымкі. Першая – знаходжанне радавога каталіцкага духавенства сярод бастуючых з мэтай аказання душпастырскай дапамогі (адначасова духавенства ўключалася ў палітычную дзейнасць), другая – афіцыйныя выступленні на гэтую тэму прадстаўнікоў касцёльнай іерархіі. Падтрымаў бастуючых рабочых і іх патрабаванні прымас Вышыньскі, хаця выказваўся ён вельмі дыпламатычна і асцярожна. Узнялі голас у абарону рабочых і біскупы Польшчы. Пэўную ролю адыграў і Папа. Менавіта дзякуючы хаця і асцярожнай, але цвёрдай падтрымцы Папы, і рашучай заяве Канферэнцыі Біскупату бастуючыя захавалі свае пазіцыі, што і прывяло да ўтварэння незалежнага прафсаюза "Салідарнасць" [6].

5. Ад самага пачатку ўзнікнення НСПС "Салідарнасць" яго адносіны з Касцёлам можна вызначыць як прыхільныя. У адносінах Касцёла і "Салідарнасці" можна выдзеліць два перыяды: першы – гэта час прымасоўства кардынала Вышыньскага. Прымас Вышыньскі прыхільна ставіўся да новапаўсталага прафсаюза, але, баючыся празмернага радыкалізму, імкнуўся кантраляваць яго дзейнасць. Але, нягледзячы на прыхільныя адносіны, кожны бок меў свае інтарэсы. Пасля смерці Вышыньскага пачынаецца другі этап у адносінах паміж Касцёлам і "Салідарнасцю". Дыстанцыя паміж абодвума бакамі ўсё больш павялічвалася. Прымас Глемп не меў такога аўтарытэта ў грамадстве, як памерлы прымас Вышыньскі, акрамя гэтага, ён па-іншаму бачыў сітуацыю. Але радавое каталіцкае духавенства, не агдядваючыся на сваё кіраўніцтва, падтрымлівала "Салідарнасць" і, такім чынам, прымала актыўны ўдзел у палітычнай дзейнасці. Аднак адносіны паміж Касцёлам і "Салідарнасцю" не азначалі тоеснасці іх інтарэсаў і палітыкі. Інтарэсы Касцёла ляжалі ў рэлігійнай сферы, у той час як інтарэсы прафсаюза ў грамадска-палітычнай. Больш таго, лідэры "Салідарнасці" імкнуліся выкарыстаць Касцёл у сваіх мэтах, а той, у сваю чаргу, усяляк гэтаму супраціўляўся. Акрамя гэтага, кожны з інстытутаў імкнуўся адасобіць сваю дзейнасць. Таму саюз "Салідарнасці" і Касцёла быў рэалізаваны хутчэй у супольнай барацьбе за вызваленне грамадства ад манапольнай улады ПАРП і яе ўціску на грамадства [3].

6. Падчас ваеннага становішча Касцёл становіцца адзіным грамадскім інстытутам, чыя дзейнасць практычна не абмяжоўваецца ўладамі. Акрамя гэтага, дзякуючы свайму становішчу, Касцёл здолеў не толькі працягваць сваю дзейнасць у грамадска-палітычным жыцці краіны, але і запоўніць грамадскі вакуум, які ўтварыўся са знікненнем "Салідарнасці". У выніку падчас ваеннага становішча Касцёл адыграў вялікую ролю ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Касцёлам былі прадпрыняты канкрэтныя крокі ў змяншэнні грамадскага напружання. Перш за ўсё ў сферы дзейнасці Касцёла была абарона правоў чалавека, а таксама дапамога інтэрніраваным і іх сем'ям, абарона іх правоў. Касцёл актыўна дамагаўся ўзнаўлення дзейнасці НСПС "Салідарнасць", нават выступіў пасрэднікам у перамовах паміж урадам і старшынёй "Салідарнасці" Л. Валенсам. У вялікай меры Касцёл падтрымаў апазіцыю і дзеячаў культуры, якія занялі пазіцыю "унутранай эміграцыі". Вялікім поспехам Касцёла стаў другі візіт Папы Яна Паўла ІІ, які, несумненна, меў дачыненне да адмены ваеннага становішча [11].

7. У другой палове 1980-х гг., асабліва ў 1988 – 1989 гг., Касцёл адкрыта заявіў аб сваіх палітычных перакананнях і пачаў умешвацца ў ход падзей у ПНР. Касцёл стаў самастойнай палітычнай сілай. Ён супрацоўнічаў з апазіцыяй і зрабіў усё для таго, каб легалізаваць дзейнасць прафсаюза "Салідарнасць". У гэты перыяд наступае карэннае змяненне у адносінах паміж Касцёлам і дзяржавай – у перамовах апазіцыі з урадам Касцёл выступаў ужо не толькі як пасрэднік, але і як паўнапраўны партнёр. Гэта спрыяла змяненню ўлады мірным шляхам і стала залогам для захавання Касцёлам моцных пазіцый у грамадска-палітычным жыцці сучаснай Польшчы [8].

# Спіс апублікаваных работ

## Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках


1. Лаўрыненка К. В. Каталіцкі Касцёл і Польская Народная Рэспубліка ў першай палове 70-х гг. XX ст. // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання: Зб. навук. пр.; У 2 ч. – Ч. 2. – Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі. – Мн.: БДПУ, 2003. – С. 143 – 154.
2. Лаўрыненка К. В. Абранне Папы Яна Паўла II і яго першы візіт у ПНР // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2003. – Т. 2. – № 3. – С. 102 – 106.
3. Лаўрыненка К. В. Касцёл і "Салідарнасць" 1980 – 1981 // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2003. – № 4. – С. 45 – 49.

**Матэрыялы выступленняў на навуковых канферэнцыях**

4. Лаўрыненка К. В. Справа паслання польскіх біскупаў да нямецкіх // Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность). Материалы международной научно-теоретической конференции, 6 – 8 декабря 2001 г. – Витебск: Издательство ВГУ им. П. М. Машерова, 2001. – С. 175 – 179.
5. Лаўрыненка К. В. Каталіцкі Касцёл у ПНР у 1970 – 1980 гг. // VII Международные Кирилло-Мефодиевские чтения, посвящённые Дням славянской письменности и культуры: Материалы чтений (Минск, 22 – 24 мая 2001 г.). В 2 ч. – Ч. 1, кн. 2. – Мн.: ООО "Ковчег", 2002. – С. 194 – 202.
6. Лаўрыненка К. В. Нарастанне супярэчнасцяў у польскім грамадстве летам 1980 года і пазіцыя Касцёла // Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире: место и значимость в развитии цивилизаций и культур (история, уроки, опыт, современность). Материалы международной научно-теоретической конференции, 31 октября – 1 ноября 2002 г. УО "Витебский госуниверситет им. П. М. Машерова". В 2 ч. – Часть 1. – Витебск: Издательство ВГУ им. П. М. Машерова, 2002. – С. 281 – 284.
7. Лаўрыненка К. В. Палітычная апазіцыя і Касцёл у ПНР // Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире: место и значимость в развитии цивилизаций и культур (история, уроки, опыт, современность). Материалы международной научно-теоретической конференции, 31 октября – 1 ноября 2002 г. УО "Витебский госуниверситет им. П. М. Машерова". В 2 ч. – Часть 1. – Витебск: Издательство ВГУ им. П. М. Машерова, 2002. – С. 284 – 291.
8. Лаўрыненка К. В. Каталіцкі Касцёл у грамадска-палітычным жыцці ПНР у 1988 – 1989 гг. // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: актуальные проблемы из исторического прошлого и современности. Материалы международной научно-теоретической конференции, 30 – 31 октября 2003 г. – Витебск: Издательство УО "Витебский государственный университет им. П. М. Машерова", 2003. – С. 255 – 259.
9. Лавриненко Е. В. Костёл и государство в ПНР в 1980 – 1981 гг. // Восточная Европа: концерт культур: Материалы III Международной научной конференции ( Санкт-Петербург). СПб., 2004. – С. 81 – 88.
10. Лавриненко Е. В. Католический костёл и государство в Польше в 1944 – 1969 гг. // Восточная Европа: феномен Балтии: Материалы IV Международной научной конференции, 27 – 28 апреля 2004 г. СПб., 2004. – С. 363 – 372.
11. Лаўрыненка К. В. Удзел Папы Яна Паўла II у польскім крызісе ў 1980 – 1983 гг. // Актуальные проблемы новой и новейшей истории Европы и США: материалы Респ. науч. конф., Минск, 31 марта 2005 г. Мн.: БДПУ, 2005. – С. 197 – 201.

# Рэзюмэ

**Лаўрыненка Кацярына Віктараўна**
**Каталіцкі Касцёл у грамадска-палітычным жыцці ПНР у 1970 - 1989 гг.**

**Ключавыя тэрміны:** Каталіцкі Касцёл, прымас, Біскупат, грамадска-палітычнае жыццё, нармалізацыя адносін, веруючы, ксёндз, правы чалавека, грамадска-палітычны крызіс, фактар напружання, грамадства, канфрантацыя, палітычная апазіцыя, "Салідарнасць".

**Мэта даследавання:** стварыць комплексную карціну дзейнасці Каталіцкага Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР у 1970 - 1989 гг.

**Аб'ект даследавання:** сацыяльна-палітычнае жыццё польскага грамадства ў 1970 - 1980-х гг. **Прадмет даследавання:** месца і роля Каталіцкага Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР, узаемаадносіны паміж Касцёлам і дзяржавай, Касцёлам і грамадствам.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў** заключаецца ў тым, што ўпершыню ў гістарыяграфіі Беларусі здзейснены сістэмны аналіз ролі і месца Каталіцкага Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР у 1970 – 1989 гг. У сваім даследаванні аўтар адмаўляецца ад панаваўшых раней ідэалагічных характарыстык у вывучэнні ролі Касцёла ў грамадска-палітычным жыцці ПНР. У рабоце па-новаму асэнсаваны ўзаемаадносіны паміж Касцёлам і дзяржавай, яго адносіны з апазіцыяй і незалежным прафсаюзам "Салідарнасць", што дало магчымасць прапанаваць новае канцэптуальнае асэнсаванне ролі Касцёла ў дадзены перыяд.

Сама пастаноўка праблемы, яе нетрадыцыйная трактоўка, крытычнае асэнсаванне канкрэтна-гістарычнага матэрыялу і атрыманых вынікаў запаўняюць прабелы ў айчыннай гістарыяграфіі ў вывучэнні гэтага пытання.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі праведзенага даследавання будуць садзейнічаць распрацоўцы новых канцэптуальных падыходаў у пазнанні і навуковай ацэнцы складаных працэсаў, якія адбываліся ў ПНР у 1970 – 1989 гг. з удзелам Каталіцкага Касцёла. Выкладзены ў дысертацыі матэрыял можа быць выкарыстаны для падрыхтоўкі вучэбнай літаратуры і абагульняючых прац, стварэння лекцыйных курсаў па гісторыі славянскіх народаў, спецыяльных курсаў па гісторыі рэлігіі.

# Резюме


## Лавриненко Екатерина Викторовна
## Католический Костёл в общественно-политической жизни ПНР в 1970 – 1989 гг.

**Ключевые понятия:** Католический Костёл, примас, Епископат, общественно-политическая жизнь, нормализация отношений, верующий, ксёндз, права человека, общественно-политический кризис, фактор напряжённости, общество, конфронтация, политическая оппозиция, "Солидарность".

**Цель исследования:** создать комплексную картину деятельности Католического Костёла в общественно-политической жизни ПНР в 1970 – 1989 гг.

**Объект исследования**: социально-политическая жизнь польского общества 1970 – 1980-х гг. **Предмет исследования**: место и роль Католического Костёла в общественно-политической жизни ПНР, взаимоотношения между Костёлом и государством, Костёлом и обществом.

**Научная новизна полученных результатов** заключается в том, что впервые в историографии Беларуси произведён системный анализ роли и места Католического Кост`ла в общественно-политической жизни ПНР в 1970 – 1989 гг. В своём исследовании автор отказывается от ранее существовавших идеологических характеристик в изучении роли Костёла в общественно-политической жизни ПНР. В работе по-новому осмыслены взаимоотношения между Костёлом и государством, его отношения с оппозицией и независимым профсоюзом "Солидарность", что дало возможность предложить новое концептуальное осмысление роли Костёла в данный период. Сама постановка проблемы, её нетрадиционная трактовка, критическое осмысление конкретно-исторического материала и полученных результатов заполняют пробелы в отечественной историографии в изучении этого вопроса.

**Практическая значимость полученных результатов**. Результаты проведённого исследования будут способствовать разработке новых концептуальных подходов в познании и научной оценке сложных процессов, которые проходили в ПНР в 1970 – 1989 гг. с участием Католического Костёла. Диссертационный материал может быть использован для подготовки учебной литературы и обобщающих работ, создания лекционных курсов по истории славянских народов, специальных курсов по истории религии.

## Resume

**Katsiaryna V. Laurynenka**

**Catholic Church in social political life of the National Republic of Poland in 1970 – 1989 years.**

**Key words:** Catholic Church, primas, episcopate, social political life, normalization of relationship, believer, priest, humans' rights, social political crisis, tensity factor, society, confrontation, political opposition, "Solidarity".

**Purpose of research:** to create a total picture of Catholic Churchs' activity in social political life of the National Republic of Poland in 1970 – 1989 years.

**Object of research:** social political life of Polish society in 1970 – 1980 years. Subject of research: place and role of Catholic Church in social political life of the National Republic of Poland, relationship between the Church and the state, between the Church and the society.

**The scientific novelty** judging by the results, is that the systemic analysis of Catholic Churchs' role and place in social political life of the National Republic of Poland in 1970 – 1989 years was made for the first time in the historiography of Belarus. In its research the author refuses the existence of ideological characteristics of learning the Churchs' role in social political life of the National Republic of Poland that took place earlier. The relationship between the Church and the state, between the Church and the opposition and the independent trade union "Solidarity" was realized in the paper in a new way. It gave the opportunity to suggest a new conceptual realization of Churchs' role in the given period. The formulation of the problem itself, its untraditional discussion, critical realization of definite historical material and results fulfill gaps in the native historiography in learning this subject.

**Practical significance of the results.** Results of the research will assist working out new conceptual ways of learning and scientific estimation of complex processes that took place in the National Republic of Poland in 1970 – 1989 years with the Catholic Churchs' participation. Research paper may be used in preparing of education literature and generalize works. Preparing of lecture courses on the history of Slavonic people, special courses on the history of religion.



Падпісана да друку 30.03.2005. Фармат 60×84/16. Папера афсетная. Гарнітура Таймс.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 1,5. Тыраж 100 экз. Зак. 313.

Надрукавана з гатовага арыгінала-макета заказчыка
ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага універсітэта».
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6.

БІБЛІЯТЭКА